*Аляксандр ВАБІШЧЭВІЧ*

# ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАЕ І АСВЕТНІЦКАЕ ЖЫЦЦЁ ПОЛЬСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ У ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 20–30-я гг. XX ст.

У беларускай гістарыяграфіі праблематыкі ўваходжання заходняй часткі Беларусі ў склад Польскай дзяржавы ў 1921–1939 гг. на працягу многіх дзесяцігоддзяў культурнае жыццё палякаў асобна не разглядалася ці падавалася ў заідэалагізаваным выглядзе. Толькі ў апошні час назіраецца больш узважлівае і аб'ектыўнае вывучэнне культуры і асветы польскай этнічнай супольнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час[1]. Улічваючы абмежаваны аб'ём дадзенай публікацыі, асноўнай яе мэтай з'яўляецца аналіз некаторых аспектаў культурна-асветніцкага, мастацкага жыцця палякаў у адзначаным рэгіёне ў акрэслены храналагічны перыяд. Для выканання пастаўленай мэты неабходна прасачыць дзейнасць асобных аб'яднанняў мастацкай самадзейнасці, адлюстраваць месца бібліятэк, народных дамоў, клубаў у задавальненні культурных, адукацыйных патрэб мясцовага польскага насельніцтва, паказаць рэальную прысутнасць сродкаў масавай інфармацыі ў грамадскім жыцці, звярнуць увагу на спецыфічны характар культуры памешчыцкіх сядзіб.

Вынікі перапісаў насельніцтва 1921 і 1931 гг. не даюць дакладнага ўяўлення аб колькасці палякаў у Віленскім, Беластоцкім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах. Для павелічэння колькасці палякаў у іх склад залічвалі беларусаў-католікаў, польскамоўных жыхароў, выкарыстоўвалі разнастайныя сродкі фальсіфікацыі вынікаў перапісу. Матэрыялы перапісу 1931 г. адносна моўнага падзелу насельніцтва да канца 1930-х гг. былі забаронены для публікацыі[2] і не былі канчаткова апрацаваны, што ў многім тлумачыцца слабой польскай прысутнасцю ў заходнебеларускім рэгіёне. Да цяперашняга часу ў беларускай і польскай гістарычнай навуцы існуюць розныя метадалагічныя падыходы пры вызначэнні нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі[3]. У цэлым шэрагу сучасных польскіх выданняў падвяргаецца сумненню афіцыйная статыстыка аб нацыянальнай структуры насельніцтва заходнебеларускіх зямель[4]. Колькасць мясцовых (“крэсовых”) палякаў у 1921 г. на тэрыторыі 24 заходнебеларускіх паветаў (акрамя Сярэдняй Літвы) ацэньваецца прыкладна ў 600 тыс. чалавек (45,8% ад агульнай колькасці насельніцтва)[5]. Паводле падлікаў П.Эберхардта, у 1931 г. сярод жыхароў Заходняй Беларусі палякаў было 1 млн. 351 тыс. чалавек (36%), у 1939 г. – 1 млн. 484,9 тыс. (таксама 36% мясцовага насельніцтва)[6]. У сучасных даследаваннях беларускіх гісторыкаў доля палякаў ацэньваецца ў 12–15% (больш чым 400 тыс. чалавек)[7].

Нягледзячы на разыходжанні ў ацэнках колькасці палякаў у беларускай і польскай гістарыяграфіі, прызнаецца іх слабая прысутнасць (у параўнанні з беларускай большасцю) сярод насельніцтва заходнебеларускіх зямель. У кантэксце інтэграцыі

гэтай тэрыторыі ў склад Польшчы адсутнасць там колькаснай перавагі палякаў, недастатковы ўзровень іх агульнай культуры (асабліва ў пачатку 1920-х гг.) диктавала неабходнасць актывізацыі намаганняў не толькі дзяржаўных структур, але і разнастайных грамадскіх арганізацый, устаноў у напрамку актывізацыі культурнага жыцця "крэсовых палякаў", пашырэння польскай культуры, адукацыі, мовы. Адной з такіх арганізацый, якая займалася пытаннямі мастацкай самадзейнасці, з'яўляўся Саюз народных тэатраў і хораў (Związek teatrów i chorów ludowych). У 1930 г. была створана трэцяя (пасля Любліна і Познані) яго ўправа – у Брэсце. Пры ёй узніклі музычна-харавая і тэатральная групы[8]. Акрамя ўправы ў Брэсце, у першай палове 1930-х гг. былі заснаваны 4 аддзелы таварыства ў Брэсцкім, Пінскім, Косаўскім паветах[9]. Палескі Саюз народных тэатраў і хораў ахапіў амаль палову настаўнікаў польскіх грамадскіх школ. Пры дапамозе Галоўнай управы ваеннай падрыхтоўкі на чыгунцы ў Брэсце быў утвораны аматарскі перасоўны тэатр "Przodownica" ("Перадавік"). Сярод яго асноўных задач былі вызначаны наступныя: штогод ставіць 20 пастановак этнаграфічнай і гістарычнай тэматыкі, класічнага рэпертуару, дзіцячых твораў, а таксама аказваць інструктарскія і кансультацыйныя паслугі адносна працы клубаў (святліц), самадзейных калектываў, праводзіць адпаведныя курсы. Прадстаўленні этнаграфічнага характару тэатра "Перадавік" (песні і танцы, у тым ліку палескія) карысталіся папулярнасцю. Толькі ў першай палове 1934 г. тэатр ажыццявіў больш за 300 пастановак. Рабіліся спробы набыць пастаянную сцэнічную пляцоўку ў Брэсце ці Пінску, аднак беспаспяхова[10]. Палескі саюз народных тэатраў і хораў разам з іншымі грамадскімі арганізацыямі, органамі мясцовай улады арганізаваў у студзені 1938 г. у Брэсце грамадскі тэатр імя Ю.Нямцэвіча, дзе акцёрскія групы працавалі пад кіраўніцтвам рэжысёра У.Выганоўскага[11]. Сваю дзейнасць тэатр разгортваў не толькі ў Брэсце, але і пераважна на тэрыторыі Палескага ваяводства, а таксама ў Беластоцкім і Люблінскім ваяводствах[12]. Музычнае таварыства ў Брэсце было ініцыятарам адкрыцця ў горадзе прыватнай музычнай школы імя К.Шымамоўскага[13]. Оперна-канцэртная секцыя гэтага таварыства рэгулярна наладжвала музычныя вечары. Мясцовы хор, балетная трупа, аркестр выконвалі класічныя творы польскай і сусветнай класікі – "Галька", "Страшны двор" С.Манюшкі, "Травіята" Д.Вэрдзі, "Яўген Анегін" П.Чайкоўскага. Перад мясцовай публікай выступалі таксама вядомыя дзеячы польскага мастацтва З.Пінінска, Б.Костшэўска і іншыя[14]. Акрамя музычнай школы ў Брэсце, напярэдадні Другой сусветнай вайны ў заходнебеларускіх землях дзейнічалі яшчэ 3 – у Пінску, Навагрудку, Баранавічах (з 149 ва ўсёй Польшчы)[15].

З сярэдзіны 1930-х гг. пачалася праца Віленскага саюза народных тэатраў і хораў. Мэтай арганізацыі з'яўлялася прапаганда польскай культуры. Арганізацыяй народных тэатраў, хораў, аркестраў займаліся і іншыя польскія грамадскія арганізацыі. У 1934/1935 навуч. годзе на тэрыторыі Віленскай школьнай акругі было 206 пастаянных і 1125 часовых тэатральных калектываў, якія зладзілі 4611 прадстаўленняў, а таксама 628 хораў. Найбольшая колькасць тэатральных (харавых) калектываў была зафіксавана ў наступных паветах: Вілейскім і Маладзечанскім – 137 (60), Лідскім – 135 (61), Стаўбцоўскім і Нясвіжскім – 132 (62)[16].

Польскамоўны рэпертуар самадзейных тэатральных калектываў быў дамінуючым. Так як беларускае насельніцтва недастаткова ведала польскую мову,

то дапускалася ўключаць у рэпертур такія беларускамоўныя творы, як “Паўлінка” Я.Купалы, “Птушка шчасця”, “Дрыгва”, “Няскончаная драма”, “Дзядзька Якуб”, “На вёсцы” Ф.Аляхновіча, “Атрута” М.Гарэцкага, “Модны шляхцюк” К.Каганца, “Пашыліся ў дурні” М.Крапіўніцкага і іншыя[17]. Аднак нельга сцвярджаць пра пазітыўнае стаўленне да беларускай культуры і мовы, бо ў красавіку 1936 г. школьныя ўлады падтрымалі стварэнне Саюза народных тэатраў і хораў як найбольш удалую арганізацыйную форму для пашырэння польскай мовы ў паўсядзённым жыцці[18]. Усяго ў 1937 г. у Польшчы існавалі 18176 самадзейных тэатральных гурткоў, студый, якія былі створаны намаганнямі розных устаноў, грамадскіх арганізацый, з іх 1984 – у заходнебеларускім краі. З існуючых у Польшчы ў 1936 г. 103 прафесійных тэатраў большасць складалі польскія (67). Акрамя стацыянарных, дзейнічалі і перасоўныя тэатральныя трупы (асабліва ў 1930-я гг.) (56 з 103)[19]. У заходнебеларускіх землях атрымалі вядомасць польскія тэатры ў Вільні (Вялікі тэатр на Пагулянцы, тэатр імя У.Сыракомлі, перасоўныя тэатры “Рохі”, пад кіраўніцтвам Будзінскага), у Гродна (гарадскі тэатр і створаны пры ім перасоўны тэатр). Аснову іх рэпертуару складалі творы польскіх аўтараў. Асноўнай функцыяй гэтых устаноў з’яўлялася пашырэнне польскай культуры. Нельга пагадзіцца са сцвярджэннямі аб тым, што польскія тэатры з’яўляліся канкурэнтназдольнымі ў параўнанні з тэатрамі іншых этнічных супольнасцей[20]. Аналіз дзейнасці польскіх тэатраў у Заходняй Беларусі сведчыць аб тым, што нягледзячы на пэўныя поспехі ў папулярызацыі польскай і сусветнай тэатральнай, музычнай спадчыны, усё-такі недахоп польскай публікі, ігнараванне нацыянальна-культурных інтарэсаў беларускага і іншага няпольскага насельніцтва, фінансавыя цяжкасці перашкаджалі іх нармальнаму функцыянаванню.

Асноўная польская культурна-асветніцкая праца ў заходнебеларускіх землях адбывалася ў клубах (святліцах), пры якіх ствараліся аркестры, харавыя і іншыя мастацкія калектывы. Адной з новых форм работы ў 1930-я гг. сталі нядзельныя і грамадскія універсітэты, курсы. Усяго ў Польшчы ў 1937/1938 навучальным годзе дзяржаўная адміністрацыя і органы самакіравання, грамадскія арганізацыі ўтрымлівалі больш 6 тыс. агульнаадукацыйных курсаў (каля 132 тыс. слухачоў), звыш 650 школ і вячэрніх курсаў (каля 14,6 тыс. слухачоў), каля 600 вясковых нядзельных універсітэтаў, каля 140 народных універсітэтаў (12,7 тыс. слухачоў), каля 19 тыс. святліц, больш 11 тыс. тэатральных калектываў і каля 6 тыс. хораў[21]. З-за недахопу фінансавых сродкаў дзяржаўная палітыка Польшчы ў сферы культуры і асветы абмяжоўвалася ліквідацыяй непісьменнасці і пачатковай адукацыяй. Менавіта таму значная частка культурна-асветніцкіх устаноў утрымлівалася органамі самакіравання, грамадскімі арганізацыямі, за кошт ахвяраванняў прыватных асоб. Нягледзячы на разнастайнасць форм, культурна-асветніцкая праца знаходзілася на нізкім арганізацыйным, матэрыяльна-тэхнічным узроўні.

Акрамя грамадскіх арганізацый, важную ролю ў культурным жыцці палякаў і іншых этнічных супольнасцей заходнебеларускіх зямель ігралі бібліятэкі. Самыя буйныя з іх знаходзіліся ў Вільні. У прыватнасці, бібліятэка Віленскага універсітэта імя С.Баторыя ў верасні 1936 г. налічвала 350 тыс. экзэмпляраў кніг, 12,5 тыс. рукапісаў, 211 інкунабул[22] (паводле іншых звестак, яе фонды складалі ў 1939 г. 598 тыс. экз.)[23]. Дзяржаўная публічная бібліятэка імя Я. і Э.Урублеўскіх мела напярэдадні Другой сусветнай вайны каля 200 тыс. адзінак. Яе фонды папаўняліся

за кошт прыватных ахвяраванняў і кнігазбораў асобных арганізацый, устаноў. У прыватнасці, туды трапілі зборы Навукова-даследчага інстытута Усходняй Еўропы (каля 10 тыс. кніг). Дзякуючы М.Пецюкевічу, які працаваў у 1930-я гг. у бібліятэцы Урублеўскіх, многія дзеячы заходнебеларускай інтэлігенцыі мелі магчымасць патаемна чытаць савецкую літаратуру[24]. У 1937 г. бібліятэка Урублеўскіх папоўнілася за кошт фондаў ліквідаванай у 1937 г. Віленскай праваслаўнай семінарыі (23,7 тыс. экз.)[25]. Буйныя кнігазборы мелі рымска-каталіцкія семінарыі ў Вільні і Пінску. У бібліятэцы Віленскай семінарыі ў 1937 г. было 56,3 тыс. экз.[26]. Фонды бібліятэкі Пінскай рымска-каталіцкай семінарыі налічвалі 42,3 тыс. кніг (1939 г.). Сярод іх было 4 тыс. старадрукаў, больш 600 рукапісаў XVII–XIX стст. У бібліятэку трапіў і ўласны кнігазбор біскупа З.Лазінскага[27]. У 1940 г. 33 тыс. кніг гэтай бібліятэкі былі вывезены ў Цэнтральны антырэлігійны музей у Маскве[28]. У Гродна гарадская бібліятэка налічвала 31,1 тыс. экз., бібліятэка гістарычнага музея – 20 тыс. экз., у 3-х бібліятэках магістрата было яшчэ 31,2 тыс. экз.[29]. Папулярнасцю ў мясцовага насельніцтва карысталася гарадская бібліятэка ў Лідзе, заснаваная ў 1922 г. Аснову яе кніжных фондаў складала прыватная калекцыя гарадскога бургамістра Р.Бергмана. У 1938 г. у гэтай бібліятэцы налічвалася 10 тыс. кніг[30]. Акрамя твораў сучасных польскіх і замежных аўтараў, у бібліятэцы асобна былі вылучаны выданні па краязнаўстве[31].

Сетка грамадскіх бібліятэчных устаноў складвалася павольна, таму розныя таварыствы, прыватныя асобы імкнуліся стварыць уласныя. Бібліятэкі асобных польскіх грамадскіх арганізацый мелі пераважна невялікія кнігазборы (пераважна 60–100 кніг і перыядычных выданняў), праводзілі разнастайную культурна-асветніцкую працу. У чытачоў найбольшым попытам карысталася перыёдыка. Пазітыўная дынаміка ў росце бібліятэчнай сістэмы назіралася ў 1930-я гг. Гэта можна прасачыць на прыкладзе Палескага ваяводства, дзе ў 1930/1931 г. было 176 бібліятэк (98 249 кніг), у 1933/1934 г. – 392 (91 336), 1936/1937 г. – 641 (146 402), 1937/1938 г. – 793 (163 833)[32]. Аднак бібліятэкі на Палессі ахоплівалі мізэрную частку насельніцтва – ад 1,3 да 2,9% жыхароў, а ў асобных мясцовасцях – менш за 1% жыхароў (напрыклад, у Пружанскім і іншых паветах)[33]. У многім гэта тлумачыцца непісьменнасцю і малапісьменнасцю мясцовага насельніцтва, нізкім узроўнем яго жыцця, асабліва ў вёсках, дрэнным веданнем польскай мовы, слабым фінансаваннем устаноў культуры.

Бібліятэкі і кнігарні папаўняліся друкаванай прадукцыяй цэнтральных і мясцовых друкарняў. У міжваеннай Польшчы налічвалася каля 560 выдавецтваў, якія выдавалі пераважна польскамоўную літаратуру і перыёдыку[34]. Колькасць перыядычных выданняў узрасла з прыкладна 500 (1918 г.) да 2,6 тыс. (1939 г.), з якіх на польскай мове складалі 80%[35]. Польскія друкаваныя сродкі масавай інфармацыі былі нацэлены на правядзенне масіраванай прапаганды, інкарпарацыю Заходняй Беларусі і паланізацыю яе насельніцтва[36]. У заходнебеларускіх землях пераважалі невялікія прыватнаўласніцкія друкарні. У сярэдзіне 1920-х гг. выдавецкай дзейнасцю ў Брэсце займалася 7 друкарняў, з якіх друкарня “Брыгада” Л.Хмялеўскага мела 3 варштаты, 10–15 рабочых, друкарня М.Тэненбаўма – 3 варштаты, 7 рабочых, іншыя налічвалі па 1–2 варштаты, 1–4 рабочых[37]. Польскамоўныя выданні складалі большасць рэгіянальнай прэсы. Так, ў 1937 г. у Палескім ваяводстве з 18

перыядычных выданняў на польскай мове друкавалася 11, у тым ліку штодзённыя газеты “Dziennik Brzeski” (“Брэсцкі дзённік”) (Брэст), “Słowo Polesia” (“Слова Палесся”) (Пінск), тыднёвік “Gazeta Poleska” (“Палеская газета”) (Брэст)[38]. На старонках “Палескай газеты”, якая выдавалася з 1933 г. да верасня 1939 г., асвятлялася грамадскае, гаспадарчае і культурнае жыццё Палескага ваяводства. У раздзеле “Палескі гаспадар” друкаваліся парады па вядзенню сялянскай гаспадаркі, народны каляндар. У выданні таксама закраналіся пытанні пра сродкі павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці, неабходнасць меліярацыі Палесся, стварэння сеткі школ і г. д. У раздзеле “Ва ўсходняга суседа” звярталася ўвага на негатыўныя праявы грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага жыцця ў СССР (калектывізацыю, рэпрэсіі), прапагандаваліся антысавецкія настроі. З гістарычных і краязнаўчых публікацый вылучаліся артыкулы Р.Гарашкевіча. Як і большасць польскай перыёдыкі, “Палеская газета” адабрала нацыянальна-культурную палітыку Польскай дзяржавы, прадстаўляла выключна польскую афіцыйную пазіцыю[39]. Аналіз зместу гэтай газеты сведчыць пра тое, што выданне адрасавалася як польскай інтэлігенцыі, так і мясцовым сялянам.

Сярод аўтарытэтных польскамоўных перыядычных выданняў варта адзначыць тыднёвік “Przegląd Wileński” (“Віленскі агляд”), які выдаваўся ў Вільні ў 1912–1913 гг., а потым быў адноўлены ў лістападзе 1921 г. і праіснаваў да кастрычніка 1938 г. Яго неадменным рэдактарам і выдаўцом з’яўляўся Л.Абрамовіч, адзін з ідэолагаў краёвай ідэі. На старонках выдання знаходзіла адлюстраванне нацыянальна-культурнае жыццё розных этнічных супольнасцей (беларусаў, палякаў, літоўцаў, яўрэяў). Акрамя рэдактара, з публіцыстычнымі артыкуламі, культуралагічнымі матэрыяламі выступалі асобныя беларускія дзеячы (У.Талочка, А.Стаповіч, У.Самойла, А.Луцкевіч і іншыя). Крытычнае стаўленне да мясцовай польскай адміністрацыі было падставай для рэпрэсіўных дзеянняў з яе боку. У другой палове 1930-х гг. кожны другі нумар тыднёвіка “Przegląd Wileński” падвяргаўся канфіскацыі[40].

Акрамя друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, пашырэнне польскай культуры і мовы адбывалася і праз радыё. Калі ў 1925 г. у Польшчы было ўсяго каля 200 радыёпрыёмнікаў (пераважна ў арміі), то напярэдадні Другой сусветнай вайны агульная колькасць абанентаў радыё складала каля 1 млн. 100 тыс. – з улікам як прыватных асобаў, так і асабліва розных дзяржаўных структур, школ, святліц, культурна-асветніцкіх установаў грамадскіх арганізацый і інш.[41]. Больш хуткімі тэмпамі ішла радыёфікацыя з сярэдзіны 1930-х гг. Аднак у вёсках радыёпрыёмнікі былі нешматлікімі. 70% абанентаў размяшчалася ў гарадах[42]. Па радыёфікацыі заходнебеларускія землі значна адставалі ад цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы: у 1938 г. колькасць радыёпрыёмнікаў на 1 тыс. жыхароў складала 9–12 (агульнапольскі паказчык – 25), а на Палессі – у некалькі разоў менш[43]. У заходнебеларускім рэгіёне радыёэфір забяспечваўся радыёстанцыяй у Варшаве, а з сярэдзіны студзеня 1928 г. – у Вільні[44]. Пануючай мовай на радыё была польская, перадачы на іншых мовах былі рэдкімі і выпадковымі. Адміністрацыйна-паліцэйскія органы праводзілі ўлік і кантроль усіх уладальнікаў радыёпрыёмнікаў, выносілі жорсткія пакаранні за ўхіленне ад рэгістрацыі. Такія прэвентыўныя меры павінны былі істотна абмежаваць практыку нелегальнага праслухоўвання

заходнебеларускімі жыхарамі савецкага радыё, якое прызнавалася "рассаднікам сепаратысцкага нацыяналізму і камунізму". У лютым 1937 г. палескі ваявода В.Костэк-Бярнацкі прапаноўваў паскорыць радыёфікацыю дзеля нейтралізацыі савецкай прапаганды[45]. Улічваючы слабы ўзровень радыёфікацыі на Палессі – у 1937/1938 г. налічвалася ўсяго 352 радыёпрыёмнікі, у снежні 1938 г. ваенныя колы для супрацьдзеяння "шкоднай дзейнасці радыёстанцыі ў Мінску" прапаноўвалі пабудаваць альтэрнатыўную радыёстанцыю, "насыціць тэрыторыю вялікай колькасцю танных радыёпрыёмнікаў, якія будуць прымаць перадачы толькі варшаўскай ці мясцовай станцыі"[46]. 31 красавіка 1938 г. пачала сваю працу радыёстанцыя ў Баранавічах. Выкарыстоўваць радыёпрыёмнікі дазвалялася толькі ў святліцах, народных дамах.

Адначасова з радыё набывала папулярнасць і кіно, асабліва ў другой палове 1930-х гг. Заходнебеларускія землі мелі самыя нізкія паказчыкі па колькасці кінатэатраў ці кіназалаў, наяўнасці ў іх месцаў гледачоў. Дазвол на адкрыццё кінатэатраў выдавала МУС Польшчы[47]. Значную частку рэпертуару кінатэатраў складалі замежныя стужкі, якія запаланілі кінарынак Польшчы. У другой палове 1920-х гг. амерыканскія фільмы складалі больш 80% замежных стужак, а ўсяго за перыяд 1924–1939 гг. з імпартных стужак амерыканскія складалі 64,1%, нямецкія – 12,5%, французскія – 10,8%[48]. Так, у спісе кінафільмаў, якія дэманстраваліся ў гарадскім кінатэатры Навагрудка ў ліпені-верасні 1937 г., былі пераважна замежныя: "Мазур", "Толькі ты", "Шлях да славы", "Злы кароль", "Я не вінаваты", "Егіпет", "Сузы", "Музычны кактэйль", "Кабінет васковых фігур", "Сын адмірала", "Герой з Тэхаса", "Сан-Францыска" і інш. Сярод адзінкавых польскіх стужак быў інфармацыйны штотыднёвік Польскага тэлеграфнага агенства ("Tygodnik PAT")[49]. Як сведчыць аналіз рэпертуару кінатэатраў Палескага ваяводства ў 1936–1938 гг., пераважалі прыгодніцкія, забаўляльныя фільмы, меладрамы[50]. У асноўным кінатэатры адкрываліся ў буйных гарадах. У Брэсце працавала 3 кінатэатры – "Адрыя", "Міраж", а таксама прыватны кінатэатр Сарвера, які стаў папулярным грамадска-культурным цэнтрам у горадзе. У Пінску дзейнічалі кінатэатры "Казіно" (на 320 месцаў), у чыгуначным клубе (190 месцаў)[51]. Сярод уладальнікаў і арандатараў кінатэатраў адчувальнай была прысутнасць яўрэяў[52]. Папулярнасць гэтага масавага віда мастацтва адбілася і на кошце білетаў на кінасеансы – у сярэднім 0,74 злотага ў канцы 1930-х гг.[53]

Польскія ўлады актыўна выкарыстоўвалі магчымасці кіно для прапаганды. Яскравымі прыкладамі прапагандысцкага польскага кіно з'яўляліся фільмы "Цуд на Віслe", "Палымянае сэрца" і іншыя[54]. Прэм'ера фільма "Палымянае сэрца" (рэжысёр – Р.Ганткоўскі) у кінатэатры "Свет" у Беластоку 27 лютага 1937 г. пераўтварылася ў ідэалагічную акцыю, у якой прымалі ўдзел ваяводскія ўлады, вайскоўцы, каталіцкае духавенства, інтэлігенцыя[55]. З сярэдзіны 1930-х гг. міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы распрацоўвала планы па кінафікацыі адукацыйных, культурна-асветніцкіх устаноў. У польскай арміі шырока выкарыстоўваліся для пашырэння культу Ю.Пілсудскага і яго ідэалагічных паплечнікаў дакументальныя стужкі "Пахаванне Маршалка Польшчы", "Пахаванне сэрца Маршалка", "Успаміны аб Маршалку Польшчы", "Няхай жыве Маршалак Рыдз-Смiглы" і іншыя.

Грамадска-культурнае жыццё памешчыцкіх сядзіб з яго элементамі шляхецкай культуры таксама адчувала ўздзеянне цэлага шэрагу фактараў. Многія з памешчыцкіх маёнткаў былі разбураны, спалены ці разрабаваны ў час Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Таму іх уладальнікам даводзілася аднаўляць палацы, набываць для іх арыгінальную мэблю, творы жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш. У маёнтках па-ранейшаму імкнуліся захоўваць сямейныя традыцыі, цікавіцца гісторыяй і генеалогіяй[56]. Салоны, паляванні набылі больш рэпрэзентатыўны характар. Напрыклад, уладальнік Давыд-Гарадоцкай ардынацыі К.Радзівіл запрашаў на шматдзённае паляванне, якое мела добрае арганізацыйнае забеспячэнне, не толькі памешчыкаў Столінскага павета, сваякоў, але і ўплывовых польскіх палітычных дзеячаў (графа К.Замойскага, князёў Любамірскіх, Друцкіх-Любецкіх і інш.), дыпламатаў. Вельмі часта ў паляванні ўдзельнічаў кіраўнік англійскай ваеннай місіі ў Польшчы генерал А.К. дэ Віярт. За сваё апякунства над ласямі на тэрыторыі сваёй ардынацыі К. Радзівіл атрымаў шэраг міжнародных узнагарод[57]. Нягледзячы на ваенныя страты і разбурэнні, у большасці маёнткаў працягвалі існаваць бібліятэкі і архівы, дзе захоўваліся старадрукі і рэдкія кнігі на розных мовах, каштоўныя гістарычныя дакументы. Так, старажытныя рукапісныя матэрыялы і каштоўная бібліятэка знаходзіліся ў памесці Р.Скірмунта ў Парэччы Пінскага павета[58]. Прыватны кнігазбор Скірмунтаў, які ў 1920 г. налічваў 1 тыс. экзэмпляраў на польскай, французскай і іншых мовах, знаходзіўся ў Моладава Драгічынскага павета[59]. Сярод буйных прыватнаўласніцкіх бібліятэк на тэрыторыі Заходняй Беларусі неабходна адзначыць таксама бібліятэку Радзівілаў у Нясвіжы (каля 10 тыс. экз.), С.Касакоўскага ў Вялікай Бераставіцы Гродзенскага павета, Віславухаў у Пярковічах Драгічынскага павета, Г.Грабоўскага ў Грушаўцы Баранавіцкага павета, пісьменніцы М.Радзевічуўны (Радзевіч) у Грушава Кобрынскага павета, К.Трымбіцкага ў Лінова Пружанскага павета і іншыя. Шырокую вядомасць ва ўсёй Польшчы атрымаў заснаваны ў 1922 г. графіняй Умястоўскай навуковы фонд імя У. і Я.Умястоўскіх, якому яна перадала фальваркі маёнтка Жамыслаў на Віленшчыне. У адным з гэтых фальваркаў быў узведзены і ўрачыста адкрыты ў жніўні 1938 г. дом адпачынку для навуковай і творчай інтэлігенцыі[60]. У асобных маёнтках іх гаспадары наладжвалі розныя культурна-забаўляльныя мерапрыемствы. Напрыклад, у маёнтку Багданава Валожынскага павета, які належаў мастаку Ф.Рушчыцу, часта збіраліся грамадскія і культурныя деячы. Папулярнасцю ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі карысталіся вечары музыкі і літаратуры ў маёнтку Флер'янова Баранавіцкага павета, які належаў Т.Бохвіцу.

У цэлым, грамадска-культурнае і асветніцкае жыццё палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час не з'яўлялася аднародным і мела свае асаблівасці. Па-першае, выразнай была тэндэнцыя ўзмацнення ідэалагізацыі ў дзейнасці культурна-асветніцкіх устаноў, асабліва з сярэдзіны 1930-х гг. Па-другое, на грамадскія аб'яднанні, установы культуры ўскладваліся задачы не толькі распаўсюджвання польскіх мастацкіх каштоўнасцей, мовы, але і паланізацыі мясцовага няпольскага (найперш беларускага) насельніцтва. Па-трэцяе, цэлы шэраг аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, выкліканых спецыфікай

сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага становішча, этна-канфесійнымі, дэмаграфічнымі і іншымі працэсамі ў заходнебеларускім краі, ускладняў культурнае жыццё “крэсовых” палякаў.

---

1 *Вабішчэвіч А.М.* Беларуска-польскія міжкультурныя адносіны ў 1919–1939 гг.: супярэчнасці і спробы іх вырашэння // Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі: Матэрыялы Міжнар. сімпозіума, Мінск, 9–10 ліпеня 2002 г.: У 2-х кн. Кн. 2 / Рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) і інш. Мінск, 2003. С. 189–194; *Вабішчэвіч А.М.* Польская адукацыя ў кантэксце заходнебеларускай рэчаіснасці 1920–30-х гг. // Acta Albaruthenika. Тэксты беларускія. Вып. 4: Зб. матэрыялаў навуковай канферэнцыі. Мінск, 2003. С. 163–170; Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А.Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М.Касцюк (гал. рэдактар) і інш. Мінск, 2006. С. 433–434; *Вабішчэвіч А.М.* Дзейнасць арганізацыі “Polska macierz szkolna” у Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. 2007. № 2 (29). С. 26–32; *Вабішчэвіч А.М.* Польскія грамадскія арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. / А.М.Вабішчэвіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2008. – № 3. – С. 72–78 і інш.

2 Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ), ф. 2, воп. 1, спр. 4968, арк. 162.

3 *Мілеўскі Я.Е.* Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 3. С. 40–42; *Міхнюк У.* Заходняя Беларусь: граніцы, тэрыторыя і насельніцтва // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 11. С. 14–21.

4 *Эберхард П.* Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897–1989. Брэст, 1997. С. 78; *Tomaszewski J., Landau Z.* Polska w Europie i świecie 1918–1939. Warszawa, 2005. S. 57 і інш.

5 *Eberhadt P.* Przemiany narodowościowe na Białorusi. Warszawa, 1994. S. 59, 61–62; *Mironowicz E. Tokć S., Radzik R.* Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku. Białystok, 2005. S. 38.

6 *Eberhardt P.* Struktura narodowościowa Polski północno-wschodniej w latach trzydziestych XX wieku // Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie na ziemiach pólnocno-wschodnich II Rzeczypospolitej (Białoruś Zachodnia i Litwa Wschodnia) w latach 1939–1941: Materiały z konferencji naukowej. Warszawa, 24–26 listopada 1993 r. / Instytut studiów politycznych PAN; Rod red. M.Giżejewskiej i T.Strzembosza. Warszawa, 1995. S. 51–52, 53.

7 Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Мінск, 1995. С. 221.

8 Gazeta Poleska. 1933. 12 listopada.

9 ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 336, арк. 85 адв.

10 ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 292, арк. 1, 7, 15; ф. 1, воп. 8, спр. 298, арк. 12, 36, 47, 50; ф. 1, воп. 8, спр. 299, арк. 26–28.

11 ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 297, арк. 1–2.

12 ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 297, арк. 3–4.

13 ДАБВ, ф. 59, воп. 1, спр. 134, арк. 6 адв. – 7 адв.

14 *Kabot T.* Teatr amatorski w Brześciu w latach międzywojennych // Echa Polesia. 2004. № 1. S. 30–31; Kabot T. Życie kulturalno-oświatowe na Polesiu w okresie międzywojennym // Białostocczyzna. 1998. № 2. S. 22–30.

15 ДАБВ, ф. 59, воп. 3, спр. 1298, арк. 2 – 5 адв.

16 Z oświaty pozaszkolnej w okręgu szkolnym Wileńskim: Sprawozdanie za rok 1934/35 i wytyczne programowe na rok 1935/36. Wilno, 1935. S. 193.

17 Z oświaty pozaszkolnej w okręgu szkolnym Wileńskim ... S. 200.

18 ДАБВ, ф. 59, воп. 3, спр. 1310, арк. 17.

19 Mały rocznik statystyczny. Warszawa, 1939. S. 338, 346.

20 *Царук Н.* Тэатральная дзейнасць у Заходняй Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 5. С. 61.

21 Encyklopedia historii Drugiej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1999. S. 276.

22 *Minczeles H.* Vilna, Wilno, Vilnius. La Jerusalem de Lituanie. Paris, 2000. P. 300.

23 Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej: Informator. Poznań, 1998. S. 628–629.

[24] *Пецюкевіч М.* У пошуках зачараваных скарбаў. Вільня, 1998. С. 112; Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі, ф. 23, воп. 1, спр. 629, арк. 62, 75.
[25] Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej… S. 635, 705.
[26] Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej… S. 624–625.
[27] Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej… S. 457–458.
[28] *Вабішчэвіч А.* Так вырашаўся ў 1940 г. лёс бібліятэкі Пінскай семінарыі // Кантакты і дыялогі. 2000. № 3. С. 8–11; *Вабішчэвіч А.М.* З архіўных матэрыялаў аб захаванні гісторыка-культурнай спадчыны Заходняй Беларусі // Берасцейскі хранограф: зб. навук. прац. Выпуск 4. Брэст, 2004. С. 353–359.
[29] Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej… S. 187–188.
[30] Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej… S. 295.
[31] *Ярмонт Е.* В тени замка Гедимина. Воспоминания детства. Лида, 1995. С. 102; Лідскі летапісец. 2002. № 4 (20). С. 11.
[32] Polski stan posiadania na Polesiu. Brześć nad Bugiem, 1939. S. 39.
[33] Polski stan posiadania na Polesiu. Brześć nad Bugiem, 1939. S. 42; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пружанскага р-на. Мінск, 1992. С. 83.
[34] *Pieczonka M.* Wileńskie firmy wydawnicze w latach 1918–1939 // Wilno i kresy północno-wschodnie: Materiały II Międzynarodowej konferencji w Białymstoku 14–17.IX.1994 r.: W 4 t. – T. 2: Kultura i trwanie / Pod red. E.Feliksiak i A.Kiselewskiej. Białystok, 1996. S. 329.
[35] *Зашкільняк Л.О., Крикун М.Г. , та ін.* Історія Польщі: від найдавніших часів до наших днів. Львів, 2002. С. 496.
[36] *Каранеўская В.У.* Палітыка ўрада II Рэчы Паспалітай у адносінах да друку нацыянальных меншасцей (1921–1926) // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2000. № 2. С. 56.
[37] ДАБВ, ф. 2, воп. 1, спр. 1176, арк. 26.
[38] ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 948, арк. 11–12.
[39] *Вабішчэвіч А.М.* "Газэта Полеска" // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. Кн. 2. Мінск, 2003. С. 362.
[40] *Nekanda-Trepka M.* Ludwik Abramowicz-Niepokójczycki – redaktor "Przeglądu Wileńskiego" // Ostatni obywatele Wielkiego Księstwa Litewskiego / Red. T.Bujnicki, K.Stępnik. Lublin, 2005. S. 49–57; Беларуская думка ХХ стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура / Склад. Ю.Гарбінскі. Варшава, 1998. С. 235.
[41] *Paczkowski A.* Prasa polska w latach 1918–1939. Warszawa, 1980. S. 323.
[42] *Żarnowski J.* Polska, 1918–1939: Praca, technika, społeczeństwo. Warszawa, 1992. S. 275, 298.
[43] *Paczkowski A.* Prasa polska w latach 1918–1939. S. 326.
[44] *Żarnowski J.* Polska, 1918–1939: Praca, technika, społeczeństwo. S. 294.
[45] ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 1656, арк. 21.
[46] ДАБВ, ф. 1, воп. 10, спр. 832, арк. 5.
[47] ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 254, арк. 1.
[48] *Żarnowski J.* Polska, 1918–1939: Praca, technika, społeczeństwo. S. 290.
[49] ДАБВ, ф. 1, воп. 10, спр. 1174, арк. 48.
[50] ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 335, 336, 338.
[51] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. С. 164–165.
[52] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ), ф. 551, воп. 1, спр. 298.
[53] Mały rocznik statystyczny. Warszawa, 1939. S. 346–348.
[54] Краткая история Польши: С древнейших времён до наших дней. М., 1993. С. 310.
[55] *Łapińska A.* Kina białostockie w okresie międzywojennym // Białystok w 80-leciu: W rocnicę odzyskania niepodległości 19 II 1919 – 19 II 1999 / Pod red. C.Kukli; Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku. Białystok, 2000. S. 125.
[56] *Мась В.* Роля сядзібаў у развіцці культуры Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. (па матэрыялах Навагрудскага ваяводства) // Białoruskie zeszyty historyczne. № 21. Białystok, 2004. S. 193.
[57] *Вабищевич А.* Усадьба Радзивиллов в Маньковичах // Radziwiłłowe. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne / Red. K.Stępnik. Lublin, 2003. S. 460.
[58] ДАБВ, ф. 1, воп. 1, спр. 74, арк. 18.
[59] Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej… S. 413.
[60] *Мась В.* Роля сядзібаў у развіцці культуры Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. ... С. 196–197.